Падтрымай "Вясну" на PATREON

У Гародні 3 ліпеня жорстка затрымалі двух актывістаў. Адзін з іх у шпіталі

дапоўнена

04.07.2018 **Тэгі**: адміністратыўны пераслед

Гарадзенскія актывісты Мікалай Салянік і Аляксандар Лаўрэнцеў 3 ліпеня, у Дзень незалежнасці, планавалі правесці пікет падчас урачыстасцяў у Гародні. Іх заблакавала міліцыя ў доме. Аўтамабіль гаспадара падперлі машынай міліцыі і хлопцаў доўга чакалі каля пад'езда.



Мікалай Салянік і Аляксандар Лаўрэнцеў

Салянік і Лаўрэнцеў у турэмных робах выйшлі на вуліцу. На іх тут жа накінуліся невядомыя ў цывільным, вельмі жорстка і брутальна скруцілі, кінулі ў бус і вывезлі ў невядомым накірунку.


Журналісту-фрылансеру **Руслану Кулевічу**, які фатаграфаваў затрыманне, нехта ў цывільным даў кулаком у твар.

Ніхто не прадстаўляўся і не паказваў дакументаў. У выніку іх даставілі ў РАУС Кастрычніцкага раёна, але ў хуткім часе, як паведаміў праваабаронца **Віктар Сазонаў**, хуткая дапамога ўвезла Мікалая Саляніка ў шпіталь. Вядома, што ў актывіста хворае сэрца. Аляксандар Лаўрэнцеў правёў ноч у ІЧУ.

Па стане на ранак чацвёртага ліпеня Мікалай Салянік па-ранейшаму знаходзіцца ў шпіталі. Па інфармацыі ад праваабаронцаў, справы Саляніка і Лаўрэнцева павінны прывезці ў суд Кастрычніцкага раёна пасля 14.00.

Твитнуть






"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА




Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў



ГАЛОЎНАЕ

Без зменаў. Адбылася апеляцыя па справе "Вясны"







АПОШНІЯ НАВІНЫ

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 11 палітычных зняволеных

Старэйшыну баптысцкай царквы “Новая Зямля” Андрэя Мамойку і яго жонку Веру асудзілі да “хатняй хіміі”

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы


Шэсць еўрапейскіх парламентарыяў сталі "хроснымі" для беларускіх палітвязняў

Да 20 гадоў калоніі: фігурантам "справы Nexta" запрасілі тэрміны

Затрыманне футбольнага фаната, новы "тэрарыст": хроніка пераследу 21 красавіка (дапоўнена)

Былога ўчастковага асудзілі да 6 гадоў калоніі па справе "Чорнай кнігі Беларусі"

"Не хацелася, каб хтосьці трапляў туды". Экс-палітзняволены Аляксандр Бабко распавёў пра пераслед па "справе цюкоў"



Рэферэндум 2022





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

СЯБРОЎСТВА

ENEMO


HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh













E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

